Беларускі дзяржаўны-архіў музей літаратуры і мастацтва

Віртуальная выстава

# «СВЯТЛО ЖАНОЧАЙ ДУШЫ»

Партрэты з фондаў БДАМЛМ

# Лідзія Арабей

(1925—2015)
Беларуская пісьменніца і літаратуразнавец, адна са стваральніц жанру вандроўных нататкаў у сучаснай беларускай літаратуры.



Ф. 202. 1960-я гг.



Ф. 316. Воп. 1. Спр. 771. Арк. 16.

# Ларыса Александроўская

(1904—1980)

Народная артыстка СССР. Знакамітая оперная спявачка і рэжысёр, грамадскі дзеяч. Яркая, прыгожая, валодала ўнікальным голасам. З 1933 па 1958 гг. была вядучай салісткай ДАВТа Беларусі: блістала ў партыях Кармэн, пушкінскай Таццяны, шолахаўскай Аксінні, Алесі ў аднайменнай оперы Я.Цікоцкага і інш.

У гады Вялікай Айчыннай вайны – удзельніца франтавых канцэртных брыгад. Праславілася як выканаўца беларускіх народных песень, у тым ліку знакамітай “Перапёлачкі”.

# Зінаіда Астаповіч-Бачарова

(1898—1993)

Беларуская мастачка, вядомая імпрэсіянісцкімі партрэтамі і пейзажамі. Ілюстравала плакаты і кнігі-казкі.



Ф. 448. Воп. 1. Спр. 282. Арк. 3.

1980-я гг.



Ф. 263. Воп. 1.  Спр. 157. Арк. 15.

# Канстанцыя Буйло

(1893 – 1986)

Беларуская паэтэса, заслужаны дзеяч культуры БССР. Першую кнігу "Курганная кветка", выдадзеную ў 1914 г. у тыпаграфіі Марціна Кухты, адрэдагаваў Янка Купала, аформіў Язэп Драздовіч. Самы папулярны верш паэтэсы "Люблю" ("Люблю наш край – старонку гэту, дзе я радзілася, расла...") доўга лічыўся народнай песняй.



Ф. 436. Воп. 1. Спр. 38. Арк. 4.

1950-я гг.

# Ядвіга Бяганская

(1908—1992)

Беларуская пісьменніца і перакладчыца, аўтар цудоўных казачных і прыгодніцкіх апавяданняў. Працавала рэдактарам на Беларускім радыё.

# Алена Васілевіч

(1922 – 2021)

Беларуская пісьменніца, заслужаны работнік культуры БССР. Працавала ў часопісе "Работніца і сялянка", выдавецтвах "Мастацкая літаратура", "Юнацтва". Майстра рэалістычных аповесцей для юнацтва, цікавых успамінаў пра сучаснікаў.



Ф. 201. Воп. 4. Спр. 378. Арк. 2.

1980-я гг.



Ф. 98. Воп. 1. Спр. 44. Арк. 2.
1950 г.

# Соф'я Друкер

(1907—1984)

Оперная спявачка, салістка Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР. Народная артыстка Беларусі. Падчас Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічала ў працы франтавых канцэртных брыгад, выступала перад партызанамі Віцебшчыны.



Ф. 220. Воп. 1. Спр. 308. Арк. 1.
1948 г.

# Ірына Ждановіч

(1906—1994)

Народная артыстка БССР. Прыма Беларускага тэатра імя Янкі Купалы, дзе доўгія гады выконвала ролі травесці. Была першай выканаўцай ролі Джульеты ў беларускамоўным спектаклі “Рамэа і Джульета”. Роля Верачкі ў спектаклі “Апошнія” М.Горкага стала трыўмфам яе творчасці. У гады Вялікай Айчыннай вайны -- ўдзельніца франтавых канцэртных брыгад.

# Раіса Кашэльнікава

(1906—1980)

Народная артыстка БССР. Актрыса тэатра і кіно. Вяршыняй творчасці стала роля Паўлінкі на сцэне купалаўскага тэатра, у якой ярка раскрыўся яе паэтычны і лірычны талент. Удзельніца франтавых канцэртных брыгад.



Ф. 96. Воп. 1. Спр. 38. Арк. 1.
1940-я гг.



Ф. 510. Воп. 1. Спр. 338. Арк. 1.

1960-я гг.

# Валянціна Коўтун

(1946 – 2011)

Беларуская пісьменніца, літаратуразнавец, драматург, перакладчык. Аўтар паэтычных твораў, раманаў, прысвечаных Еўфрасінні Полацкай (“Пакліканыя”) і Алаізе Пашкевіч (“Крыж міласэрнасці”).

Працавала ў часопісах “Полымя”, “Маладосць”, выдавецтве “Юнацтва”. Старшыня Усебеларускага жаночага фонду святой Еўфрасінні Полацкай.

# Аляксандра Клімава

(1921—2005)

Народная артыстка СССР. Актрыса тэатра і кіно. Зорка рускай сцэны ў гісторыі беларускага тэатральнага мастацтва. Лепшыя ролі ў Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М.Горкага адзначаны глыбінёй думкі, псіхалагізмам, сілай пачуццяў, жаноцкай абаяльнасцю: Камісар (“Аптымістычная трагедыя” У. Вішнеўскага), Ніла Сніжко (“Барабаншчыца” А. Салынскага) і інш. У класічным рэпертуары створаны незабыўныя вобразы Клеапатры, ледзі Макбет, Марыі Сцюарт, Ларысы Агудалавай, Ранеўскай і інш.



Ф. 228. Воп. 1. Спр. 128. Арк. 3.

1980-я гг.



Ф. 141. Воп. 1. Спр. 113. Арк. 1.
1950-я гг.

# Еўдакія Лось

(1929 –1977)
Беларуская паэтэса, празаік, перакладчык, дзіцячая пісьменніца. Працавала ў газеце “Звязда”, часопісе “Работніца і сялянка”, галоўным рэдактарам часопіса “Вясёлка”.

# Любоў Мазалеўская

(1903 – 1964)
Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР.
Актрыса тэатра і кіно, рэжысёр, педагог.
Арганізатар і галоўны рэжысёр Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача.



Ф. 292. Воп. 1. Спр. 238. Арк. 1.
1939 г.

# Галіна Макарава

(1919 – 1993)

Народная артыстка СССР. Выдатная актрыса тэатра і кіно. Свае зорныя ролі сыграла ў спектаклях па п’есах А.Макаёнка ў тэатры імя Янкі Купалы: Марыя Гарошка (“Выбачайце, калі ласка”), Лушка (“Лявоніха на арбіце”), Паліна (“Трыбунал”), Старая (“Святая прастата”) і інш.

Здымалася ў кінафільмах: “Вдовы”, “Сад”, “Деревья на асфальте”, “Фруза”, “Белыя росы” і інш.



Ф. 433. Воп. 1. Спр. 89. Арк. 1

1939 г.




# Рыта Млодак

(1906 – 1969)

Народная артыстка БССР. Адна з вядучых салістак Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР. Лепшая выканаўца партыі Надзейкі ў оперы А.Туранкова “Кветка шчасця”.

# Лідзія Мухарынская

(1906 – 1987)

Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. Беларускі музыказнавец, фальклярыст, педагог. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны.

Выкладала ў Белдзяржкансерваторыі. Даследавала беларускую народную музычную творчасць, у прыватнасці партызанскую песню.



Ф. 349. Воп. 1. Спр. 226. Арк. 005.

# Паўліна Мядзёлка

(1893—1974)

Беларуская грамадская дзяячка, тэатральная актрыса, пісьменніца, педагог. Заслужаны дзеяч культуры БССР. Напісала ўспаміны “Сцежкамі жыцця”.

Адна з найбольш каларытных асобаў беларускай гісторыі XX ст.



Ф. 403. Воп. 1. Спр. 54. Арк. 3.

1923



Ф. 109. Воп. 2. Спр. 58. Арк. 1.
1935 г.

# Аляксандра Нікалаева

(1906—1997)

Народная артыстка БССР. Адна з самых яркіх зорак айчыннай харэаграфічнай сцэны, педагог. Стварыла вобразы Зоські (“Салавей” М. Крошнера) і Надзейкі (“Князь-возера” В.Залатарова) ў першых нацыянальных балетах. Свой велізарны сцэнічны вопыт выкарыстала ў 30-ці гадовай працы ў Мінскім харэаграфічным вучылішчы і Народнай студыі класічнага танца Палаца культуры прафсаюзаў.

# Алаіза Пашкевіч-Кейрыс

(1876—1916)

Вядомая беларуская пісьменніца, педагог, грамадская і палітычная дзеячка. Выдатная прадстаўніца беларускага нацыянальнага адраджэння. Публікавалася пад псеўданімам Цётка. Аўтар зборніка вершаў “Скрыпка беларуская” (1906), выдавала для моладзі часопіс “Лучынка”. У творчасці кіравалася ідэямі позняга рамантызму і гуманізму.



Ф. 394. Воп. 1. Спр. 43. Арк. 1.
[п. 1900-х гг.]



Ф. 283. Воп. 1. Спр. 120. Арк. 3.

1920-я гг.

# Стэфанія Станюта

(1905—2000)

Народная артыстка СССР. Актрыса тэатра і кіно. Зорка беларускай сцэны, чалавек унікальны, светлы і сонечны. У тэатры імя Янкі Купалы сыграла рознахарактарныя ролі Зёлкінай (“Хто смяецца апошнім” К.Крапівы), Дзіяны (“Сабака на сене” Лопэ дэ Вегі), Бабусі (“Я, бабуся, Іліко і Іларыён” Н.Думбадзе), Мод (“Гаральд і Мод” К.Хігінса і Ж.-К. Кар’ера) і інш.
У фільмаграфіі С.Станюты каля 60 работ. Вяршыняй стаў вобраз Дар’і ў кінафільме Л.Шэпіцька і Э.Клімава “Прощание”.



Ф. 109. Воп. 1. Спр. 22. Арк. 3.
1949 г.

# Тамара Узунава

(1906–1983)

Артыстка балета, педагог, салістка Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР. Выконвала танцы ў оперных і балетных спектаклях.

У гады Вялікай Айчыннай вайны выступала ў складзе франтавых канцэртных брыгад.

**Генадзь Бураўкін**

**Жанчын прыгожых трэба берагчы…**

Жанчын прыгожых трэба берагчы
Ад пошласці, каварства і знявагі,
І ад мяшчанскай зайздрасці і звягі,
І ад залішняй ветласці і ўвагі,
І ад рукі нахабнай на плячы.

Яны прыйшлі на грэшную зямлю,
Як сны і летуценні залатыя,
Жаданыя і трошачкі святыя,
Нязнанага суладдзя панятыя,
Святлом напоўніць вечнае «люблю».

Не дайце іх зняславіць і запляміць,
Не рвіцеся ўчыняць над імі суд.
Хай горда па жыцці яны нясуць
Вясны юначай радасную памяць,
Зачаравання невыказны цуд…
1985